**Сказ  усемагутны гаспадар сінтаксісу**

**Факультатыўны занятак па беларускай мове “Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам” ў 8 класе.**

**А. С. Кель,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі

**Тэма:** Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам

**Мэта:**

Мяркуецца, што да канца факультатыўнага занятку вучні будуць ведаць умовы пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам;

**будуць умець**

– правільна вызначаць умовы пастаноўкі працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам;

– ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам;

– канструяваць сказы з ужываннем працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам ва ўласным вусным і пісьмовым маўленні.

**Задачы:**

– спрыяць развіццю ўменняў працаваць з тэкстам; карыстацца асабістым вопытам падчас абмеркавання праблемнага пытання, выказваць і аргументаваць сваё меркаванне, рабіць высновы;

– удасканальваць камунікатыўныя уменні, неабходныя для работы ў пары, у школьным калектыве;

– сродкамі зместу факультатыўнага занятку, яго матэрыялам падтрымліваць цікавасць да роднага слова, выхоўваць грамадзянскасць, патрыятычныя пачуцці гонару за Радзіму, свой народ.

**Месца занятку ў тэме** “Сказ – усемагутны гаспадар сінтаксісу” (17 г.): 7-ы.

**Тып занятку:** камбінаваны.

**Тэхналогія** поўнага засваення ведаў.

**Метады навучання:** камунікатыўны, наглядны, практычны.

**Міжпрадметныя сувязі:** беларуская літаратура.

**Абсталяванне:** афармленая дошка, наглядны матэрыял, лісты з дыдактычным матэрыялам, ноўтбукі, творчыя работы вучняў класа.

**Ход факультатыўнага занятку**

Радзіма – гэта і сонца  ў цябе над галавой,
і паветра, якім дыхаеш, гэта і вернасць твайго
сябра, і мова, якую даў табе народ, і песня,
што засталася ад прадзедаў.

К.Кірыенка

**I.АРГАНІЗАЦЫЙНА-МАТЫВАЦЫЙНЫ ЭТАП.**

**Настаўнік:**

– Добры дзень! Які ў вас настрой? Старажытныя грэкі казалі: “Добры настрой – гэта палова перамогі”. Таму ўсміхніцеся адзін аднаму, і я жадаю вам сёння на факультатыўным занятку атрымаць перамогу ў барацьбе за веды.

**Вучань** чытае выказванне К.Кірыенкі пра Радзіму.

**Настаўнік:**

– Падбярыце сінонімы і блізказначныя словы да слова “радзіма”.

(Магчымыя адказы: бацькаўшчына, айчына, родны край, свой край, наш край, родная краіна, свая краіна.)

– Якія асацыяцыі ўзнікаюць у вас, калі гучыць слова “радзіма”?

– Калі спытаць, ці любіце вы сваю радзіму, то, безумоўна, адкажаце: “Так!”. Яшчэ Уладзіслаў Сыракомля пісаў: “Нельга палюбіць родную маці-зямлю без глыбокага і шырокага пазнання ўсяго яе аблічча…”.

Вучні тлумачаць разуменне паняццяў “вялікая радзіма” і “малая радзіма”.

– Таму сёння на факультатыўным занятку звернемся да прыказак і афарызмаў пра радзіму, да вершаў вядомых беларускіх паэтаў і ,канешне, да вашых творчых работ.

**II.ТЭМАВЫЗНАЧЭННЕ.МЭТАВЫЗНАЧЭННЕ.**

Настаўнік паведамляе тэму ўрока. Вучні з дапамогай апорных слоў “ведаць”, “умець” ставяць задачы да факультатыўнага занятку.

**III.ІНФАРМАЦЫЙНА-ПОШУКАВЫ ЭТАП.**

*1.Бліц-апытванне:*

Сказ – …

Прыметы сказа – …

Функцыі сказа –…

Знакі прыпынку –…

Працяжнік ставіцца –…

Функцыя працяжніка –…

Дзейнік – …

Выказнік – …

Парадак слоў можа быць …

*2.Праца з тэкстам (гл.уласны маналог вучаніцы пра Ваўкавыск у дадатку 1).*

*Арфаграфічная мазаіка.*

*Заданне:* устаўце прапушчаныя літары, растлумачыць правапіс арфаграм.

(Адзін вучань піша на дошцы , а астатнія вучні выконваюць заданне на лістах з дыдактычным матэрыялам.)

*Сінтаксічная хвілінка.*

*Заданне:* вызначыць віды сінтаксічнай сувязі ў падкрэсленых словазлучэннях, пабудаваць схемы прапанаваных словазлучэнняў.

(Тры вучні працуюць каля дошкі, а астатнія вучні – на лістах з дыдактычным матэрыялам.)

*Пунктуацыйная размінка.*

*Індывідуальнае заданне:* у выдзеленых сказах растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку пры дапамозе схем.

*Праблемнае пытанне.* Пастаноўка працяжніка ў другім выдзеленым сказе.

(Астатнія вучні выконваюць вусна *лінгвістычны аналіз тэксту*: тэма, асноўная думка, стыль і тып маўлення.)

*”Самы назіральны і здагадлівы”.*

*Заданне:* знайсці ў тэксце словы , якія адпавядаюць запісаным на дошцы лексічным значэнням.( Адказы прымацаваць на дошцы.)

… – вялікі сад, гай з алеямі, кветнікамі. (Парк.)

… – невялікі грамадскі сад у горадзе. (Сквер.)

*”Падумайце, паразважайце”.*

*Заданне:*Штодзённы і жыццё. Фанетычнае падаўжэнне ці марфалагічнае падваенне?

*3.Запаўненне табліцы* “Працяжнік ставіцца” і “Працяжнік не ставіцца”.

(Вучні працуюць у парах. На дошцы – наглядны матэрыял (пасля праверкі).(Дадатак 2)

*4.Міні-даследаванне*, загадзя праведзенае вучаніцай .

Зачытваюцца і тлумачацца сказы на пастаноўку або адсутнасць працяжніка. Гэта падабраны матэрыял, які не знайшоў адлюстравання ў вучэбным дапаможніку па беларускай мове.

*5.Літаратурная хвілінка.* (Вучаніца чытае на памяць уласны верш пра Ваўкавыск. Гл.дадатак 3)

*Заданне:* патлумачыць пастаноўку або адсутнасць працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам , знайсці сказы з аўтарскай пастаноўкай працяжніка (інтанацыйны працяжнік).

*Праблемнае пытанне.* Пастаноўка працяжніка ў другой страфе верша.

**IV.ФІЗКУЛЬТХВІЛІНКА.**

**V.ТРЭНІРОВАЧНА-КАРЭКЦЫЙНЫ ЭТАП.**

*1.Творчы дыктант.*

*Заданне:* закончыць прыказкі, растлумачыць пастаноўку або адсутнасць працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам.

Жыць –( Радзіме служыць).

Вучыць – (розум тачыць).

Вучэнне без умення не (карысць, а бяда).

Без справы жыць – (неба куродыміць).

Радзіма – (матка), а чужына – (мачыха).

Чужая старана – (цёмны лес).

Чужына не (родная матка).

*“У скарбонку алімпіядніка”*

*Заданні:*Ці аднолькавы суфікс у словах вучэнне і ўменне?

Карыслівы і карысны – словы-амонімы?

*2.Літаратурны калаж* "Узбагачаем мову мастацкім словам".

*Заданне:*прыгадаць радкі з вершаў беларускіх паэтаў, афарызмы пра Беларусь, пра родную зямлю і патлумачыць пастаноўку або адсутнасць працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам.

(Магчымыя адказы:

Беларусь – крыніца песні і любві крыніца (Сяргей Панізнік).

Мы дзеці сваёй Беларусі (Янка Купала).

Любіць Радзіму – значыць берагчы сваю спадчыну (Янка Купала).

Бараніць родны край – гэта рыцараў справа (Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч).

Свая зямля – вось што аснова (Якуб Колас).

Зямля – аснова ўсёй айчыне (Якуб Колас).

Бацькаўшчына – гэта дом твой, школа, гэта песні, што звіняць наўкола (Пімен Панчанка).)

(Прыгадваецца каляндар юбілейных дат, якія адзначаюцца ў 2016/2017 навучальным годзе: ліпень 135-годдзе з дня нараджэння Янкі Купалы,
жнівень100-годдзе з дня нараджэння Пімена Панчанкі.)

**VI.КАНТРОЛЬНА-РЭФЛЕКСІЎНЫ ЭТАП.**

*Праца з ноўтбукамі.Тэст* (гл.дадатак 4).

**Настаўнік:**

–Як вы лічыце, ці справіліся з задачамі, пастаўленымі ў пачатку факультатыўнага занятку?

Вучні ацэньваюць сваю працу па алгарытму "Лесвіца поспеху":

Ведаю…

Умею…

Магу…

**VII.РЭФЛЕКСІЯ.**

**Настаўнік:**

–Сёння вы мелі магчымасць яшчэ раз адчуць і зразумець, што Беларусь – …

(Магчымыя адказы: – цудоўная і непаўторная краіна.
– багатая на гістарычныя падзеі краіна.
– самая мірная ў свеце краіна.
– адказны і надзейны партнёр, які жадае ўсім народам міру і дабра.)

*Зварот да эпіграфа.*

**Настаўнік:**З якім настроем вы пойдзеце з факультатыўнага занятку?

– Беларусы – гасцінныя і добразычлівыя людзі. Што вы пажадаеце нашым гасцям? (Гучаць пажаданні для гасцей.)

**Дадатак 1**

*Ваўкавыск адзін са страраж…тнейшых гарадоў Беларусі, гісторыя якога налічвае больш за тыс…чу гадоў.Ву…кія вулачкі старога мястэчка, новыя мікраараёны,* ***прыгож…я паркі*** *і скверы, сучасная плошча з фантанам усё гэта мой родны горад.* Прыемна **вечарам пагуляць** па наб…рэжнай ракі Ваўкавыя. Цікава **палічыць прысту…кі** на Шве…кай гары, а потым палюбава...ца роднымі краявідамі з выш…ні птуш…нага палёту. *Прыгажос…ць вокам не абняць!* Ёсць, што пагляд…ець,і ёсць, што людзям паказаць. На жаль, у штодзённым жыцці мы раз…учыліся за…важаць простыя і прыгожыя рэчы…

*Бачыць прыгожае навокал значыць любіць свой горад, свой родны край.*

Ваўкавыск – адзін са старажытнейшых гарадоў Беларусі, гісторыя якога налічвае больш за тысячу гадоў. Вузкія вулачкі старога мястэчка, новыя мікраараёны, прыгожыя паркі і скверы, сучасная плошча з фантанам – усё гэта мой родны горад. Прыемна вечарам пагуляць па набярэжнай ракі Ваўкавыя. Цікава палічыць прыступкі на Шведскай гары, а потым палюбавацца роднымі краявідамі з вышыні птушынага палёту. Прыгажосць – вокам не абняць! Ёсць, што паглядзець,і ёсць, што людзям паказаць. На жаль, у штодзённым жыцці мы развучыліся заўважаць простыя і прыгожыя рэчы…

Бачыць прыгожае навокал – значыць любіць свой горад, свой родны край.

**Дадатак 2**

**Працяжнік ставіцца і не ставіцца паміж дзейнікам і выказнікам**

1.Наз. – наз. (прамы парадак слоў)
2.Наз. – інф.
3.Інф. – наз.
4.Наз. – наз. (інверсія)
5.Займ. – наз.
6.Ліч. – ліч.
7.Наз. – колькасна-іменнае спал.
8.Наз. – займ.
9.Наз. – прым.
10.Наз. – адмоўная часц. – наз.
11.Наз. – дзеепрым.
12.Наз. – фразеал.
13.Інф. – адмоўная часц. – інф.
14.Наз. – пабочнае слова – наз.
15.Наз. – недапас.даданы чл. – наз.
16.Наз. – параўн.зл. – наз.
17.Наз. – указ.сл. – наз.
18. Інф. – указ.сл. - інф.
19.Наз. – усеч.форма дзеясл.
20.Наз. – выклічнік.

**Дадатак 3**

Ваўкавыск мой! Ты – калыска
Мар дзяцінства, цудаў, сноў.
Ты– усё, што сэрцу блізка,
Ты – выток маіх асноў!

Ваўкавыск – мой горад родны.
Тут жыве мая сям’я.
Тут – магілы маіх продкаў,
Тут – гісторыя мая.

Старажытны ён, як казка,
Што гучыць паміж муроў,
Льецца сонечнаю ласкай
Ужо за дзесяць больш вякоў.

Ён гісторыяй багаты,
Ён прайшоў праз тры вайны.
Баранілі свае хаты
Яго слаўныя сыны.

Адбудоўваўся старанна,
Не баяўся перашкод.

Я ў адным перакананa:
Родны горад – патрыёт.
Пажадаць яму хачу я
Шчасця, радасці, даброт.
Бо багацце яго – людзі,
Працавіты наш народ!

**Дадатак 4**

**1.Адзначце правільныя сцверджанні.**

1.Сказ – гэта асноўная сінтаксічная адзінка, якая служыць сродкам фарміравання, выражэння і паведамлення думак, перадачы эмоцый і волевыяўлення.
2.Парадак слоў у сказе можа быць прамым і адваротным.
3.Сродкам выражэння граматычнага значэння сказа з’яўляецца форма дзейніка.
4.Дзейнік – галоўны член сказа, які абазначае прадмет маўлення.
5.Выказнік – галоўны член сказа, які абазначае тое, што гаворыцца пра дзейнік.

**2.Адзначце спосабы выражэння дзейніка і выказніка, паміж якімі павінен заўсёды ставіцца працяжнік.**

1.Дзейнік-назоўнік і выказнік-інфінітыў.
2.Дзейнік-лічэбнік і выказнік-назоўнік.
3.Дзейнік-назоўнік і выказнік-прыметнік.
4.Дзейнік-назоўнік і выказнік-займеннік.
5.Дзейнік-назоўнік і выказнік-учечаная форма дзеяслова.

**3.Адзначце спосабы выражэння дзейніка і выказніка, паміж якімі не ставіцца працяжнік.**

1.Дзейнік-займеннік і выказнік-назоўнік.
2.Дзейнік-назоўнік і пры выказніку-назоўніку ёсць адмоўная часціца не.
3.Дзейнік-назоўнік і выказнік-фразеалагізм.
4.Дзейнік-назоўнік і выказнік-дзеепрыметнік.
5.Дзейнік-інфінітыў і выказнік-інфінітыў.

**4.Адзначце сказы, дзе паміж дзейнікам і выказнікам неабходна паставіць працяжнік.**

1.Мінулае падмурак будучыні.
2.Мы нашчадкі продкаў- герояў.
3.Свая хатка як родная матка.
4.Самы вялікі грэх нічога не рабіць.
5.Ён тут за старшага.

**5.Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік.**

1.Пра ўсё даведацца і ўсё ўбачыць ___вось мая мара.
2.Наш сённяшні час ___гэта ўсяго толькі адно імгненне ў шматвяковай гісторыі беларускага народа.
3.Твая задача ___сачыць за ходам вопыту і апісваць тое, што бачыш.

4.Думка,выказаная ўголас, ___гэта ўжо ўчынак.
5.Мы ___людзі свабодныя.

**6.Адзначце сказы, у якіх на месцы пропуску працяжнік не ставіцца.**

1.Галоўнае ___не спяшацца.
2.Хлопцы, відаць, ___выдатнікі.
3.Адзін у полі ___не воін.
4.Быць сапраўдным сябрам ___жыць інтарэсамі сябра.
5.Ты ___маё шчасце, мая радасць.

**7.Якім членам сказа з'яўляецца выдзеленае слова? Адказ запішыце ў пачатковай форме.**

Цікавы субяседнік **Васіль**.

**8.Якую часціну мовы трэба напісаць на месцы пропуску, каб не ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам? Адказ запішыце ў пачатковай форме.**

Адлегласць __перашкода для сяброў.